**С.П.Васільева,**
*аспірантка кафедры беларускай і сусветнай мастацкай культуры*

# МЕНТАЛІТЭТ І НАЦЫЯНАЛЬНАЯ ВЫКАНАЛЬНІЦКАЯ ШКОЛА

Тэрмін "менталітэт" ужываецца ў навуковай літаратуры з сярэдзіны XIX ст. Але на сённяшні дзень агульнапрынятага азначэння гэтага тэрміна не існуе. Кожны даследчык трактуе яго так, як яму здаецца найбольш дапушчальным.

Тэрмін "менталітэт", як вядома, прыйшоў з лацінскай мовы, дзе ён меў больш дзевяці значэнняў (розум, мысленне, вобраз думак, настрой думак, светаўспрыманне і інш.). Ужо ў гэтай шматзначнасці лацінскага слова закладзена магчымасць самага шырокага яго тлумачэння і ўжывання. Таму мы можам сутыкнуцца з вельмі рознымі трактоўкамі тэрміна. Гэта і вераванні, і псіхіка, і мараль, і склад або манера мыслення, і калектыўная псіхалогія, і светаўспрыманне, і невербалізаваныя ўстаноўкі свядомасці. Мы засяродзім увагу на такім азначэнні: "Менталітэт — спецыфічны спосаб мыслення, светаўспрымання, светабачання, уласцівы пераважнай большасці людзей якой-небудзь нацыянальнай супольнасці" (1).

Менталітэт фарміруецца на працягу жыцця многіх пакаленняў пад уплывам прыродна-геаграфічных, сацыяльна-палітычных, эканамічных, этнакультурных, этнагенетычных, маральна-духоўных фактараў. Менталітэт — паняцце ўстойлівае, але з цягам часу яно эвалюцыянуе. Пад уплывам палітычных, эканамічных і іншых змен у грамадстве менталітэт можа ўзбагачацца або, наадварот, дэградаваць. Але працэс эвалюцыі менталітэту больш павольны, чым сацыяльна-палітычныя і эканамічныя змены ў грамадстве.

Сам народ і ўмовы яго жыцця ўздзейнічаюць на фарміраванне манталітэту нацыі. І адначасова менталітэт

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

на падсвядомым узроўні ўздзейнічае на кожнага асобнага прадстаўніка азначанай нацыянальнай супольнасці. Чалавечая індывідуальнасць у працэсе свайго развіцця засвойвае менталітэт народа, іншымі словамі, нормы, ідэалы, уяўленні, эмацыянальныя і каштоўнасныя арыентацыі, манеру мыслення свайго народа. Менталітэт накладвае своеасаблівы адбітак на ўсе сферы жыццядзейнасці чалавека, у тым ліку і на творчасць.

Асабліва яскрава менталітэт нацыі праўляецца ў галіне выяўленчага і музычнага мастацтва. У творах мастакоў і кампазітараў незалежна ад іх жадання або нежадання адлюстроўваюцца асаблівасці псіхалогіі і мыслення народа. Гэта тычыцца тых выпадкаў, калі кампазітар або мастак большую частку свайго жыцця правёў у гэтай краіне, сярод гэтага народа. Вядомы рускі мастак І.М.Крамской адзначаў: "...Каб быць у мастацтве нацыянальным, аб гэтым турбавацца не трэба — неабходна толькі даць поўную свабоду творчасці. Пры поўнай свабодзе творчасці нацыянальнасць, як стыхійная сіла, натуральна (як вада па ўхіле) будзе наскрозь прапітваць усе творы мастакоў дадзенага племя, хаця б яны, па асабістых сваіх сімпатыях, і былі далёкія ад чыста народных матываў" (2).

Калі ў творчасці мастака і кампазітара менталітэт праяўляецца, то ўзнікае пытанне, ці праяўляецца ён у творчасці выканаўцаў і, наогул, у нацыянальнай выканальніцкай школе. Ужываючы паняцце "выканальніцкая школа", маем на ўвазе групу выканаўцаў, звязаных агульнымі творчымі прынцыпамі, пераемнасцю традыцый, прафесійнымі прыёмамі, нацыянальна-стылявымі традыцыямі. Калі звярнуцца да вакальнага выканання, знаходзім такое вельмі важнае, на наш погляд, тлумачэнне: "Вакальная школа — сістэма выканаўчых прынцыпаў і педагагічных метадаў, якія фарміруюцца ў музычнай культуры народаў розных краін. У нацыянальнай школе адбіваюцца асаблівасці псіхічнага складу дадзенага народа, яго музыкі, паэзіі, мовы, выканаўчых традыцый" (3).



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Зразумела, што ў інструментальнай выканальніцкай школе таксама павінны праявіцца асаблівасці псіхалагічнага складу і манеры мыслення народа (іншымі словамі, менталітэту), яго музыкі, мовы, выканаўчых традыцый. Выкананне заўсёды суб'ектыўна, яно нясе ў сабе адбітак чалавечай індывідуальнасці, а значыць, адбітак менталітэту народа і нацыянальных асаблівасцей характару. У сувязі з гэтым магчыма гаварыць аб асаблівасцях нацыянальных выканальніцкіх школ.

Нацыянальны элемент выканання разглядаецца ва ўзаемасувязі з інтэрнацыянальным як характэрны нюанс, які змяняе сам сэнс мастацкай з'явы. У выканаўцаў розных краін, вядома, ёсць агульныя рысы, і даволі значныя, але толькі ў суайчыннікаў яны вельмі блізкія. І блізкасць гэта абумоўлена менавіта менталітэтам нацыі. Толькі творчасць вядомых выканаўцаў краіны, разам узятых, вызначае нацыянальную самабытнасць выканальніцкага стылю і праз гэта нацыянальную самабытнасць выканальніцкай школы.

Такім чынам, адзначым, што выканальніцкі стыль з'яўляецца своеасаблівай праекцыяй комплексу нацыянальных псіхалагічных рыс і асаблівасцей менталітэту на выкананне. Адначасова выканальніцкі стыль з'яўляецца важным кампанентам нацыянальнай выканальніцкай школы.

Акрамя таго, вялікае ўздзеянне на выканаўцаў аказваюць і непасрэдна творы, якія яны выконваюць. У рэпертуары кожнага выканаўцы значнае месца займаюць творы нацыянальных кампазітараў. У гэтых творах, як адзначалася вышэй, назалежна ад жадання саміх кампазітараў адлюстроўваюцца асаблівасці псіхалогіі і мыслення іх народа. Такім чынам, менталітэт цераз творы нацыянальных кампазітараў уздзейнічае на асобнага выканаўцу незалежна ад яго жадання ў працэсе работы над гэтымі творамі.

У заключэнне падкрэслім, што менталітэт нацыі ўздзейнічае на ўсе сферы жыццядзейнасці чалавека. У галіне музычнага мастацтва гэта можна заўважыць у творах

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

кампазітараў і ў выканальніцкім стылі музыкантаў кожнай краіны. Менталітэт з'яўляецца важным і магчыма самым галоўным фактарам ў фарміраванні нацыянальнай выканальніцкай школы.

*1. Мельнікаў А.* Характар і менталітэт беларусаў // Беларуская думка. — 1997. — № 7. — С. 103.
*2. Крамской И.Н.* Об искусстве. — М., 1988. — С. 40.
*3. Коченева И., Яковлева А.* Вокальный словарь. — Л., 1988. — С. 15.

**Г.М.Водчыц,**
*аспірантка кафедры беларускай і сусветнай мастацкай культуры*

## ІНТЭРПРЭТАЦЫЯ БЕЛАРУСКАГА ФАЛЬКЛОРУ Ў СУЧАСНЫМ ХАРЭАГРАФІЧНЫМ МАСТАЦТВЕ

На працягу амаль сямідзесяці гадоў існавання беларускай сцэнічнай харэаграфіі балетмайстры пастаянна звяртаюцца да фальклору як крыніцы для стварэння харэаграфічных твораў, што, па-першае, спрыяе ўзбагачэнню і ўзнаўленню арсенала выразных сродкаў нацыянальнай харэаграфіі і , па-другое, стымулюе творчы працэс, а таксама служыць захаванню беларускай нацыянальнай танцавальнай традыцыі. Таму, безумоўна, у даследаванні вельмі важна прасачыць, як адбываўся працэс інтэрпрэтацыі фальклору ў беларускай сцэнічнай харэаграфіі.

Змяненне ўмоў існавання традыцыйнага народнага танца і пачатак выкарыстання яго твораў у сцэнічнай практыцы беларускіх калектываў у 30-х гг. XX ст. выклікалі неабходнасць яго творчага пераасэнсавання і ўзнікнення спосабаў мастацкай апрацоўкі фальклорных твораў. У адрозненне ад фальклорнага ўзору сцэнічны танец арыентуецца на гледача і падпарадкоўваецца законам яго ўспрымання. Пры пераносе на сцэну традыцыйны танец



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ